*Рэдакцыя часопіса «Бібліятэчны свет» адкрывае на сваіх старонках новую рубрыку «Актуальнае інтэрв'ю». Першым госцем з'яўляецца намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь, член рэдакцыйнай калегіі часопіса* ***Васілій Мечыслававіч Чэрнік****, з якім мы правялі размову па самых актуальных пытаннях развіцця бібліятэчнай справы ў нашай краіне.*

*Фота Ю. Іванова*



**– Паважаны Васілій Мечыслававіч, рэалізуецца Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2011–2015 г. Якія вынікі развіцця бібліятэчнай галіны ў 2013 г. і якія арыенціры дзяржаўнай палітыкі вызначаны на будучыню?**

У мінулым годзе працягвалася фарміраванне інфармацыйнай прасторы нашай краіны. Бібліятэкі паранейшаму заставаліся базавым звяном гэтага працэсу. Так, праводзіліся работы па фарміраванні карпаратыўных электронных інфармацыйных рэсурсаў. Сярод напрацовак і дасягненняў – значнае пашырэнне аб'ёму зводнага электроннага каталога сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі. Шмат работ выканана па арганізацыі і стварэнні зводнага электроннага інфармацыйнага рэсурсу нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі. Актуалізоўваліся рэгіянальныя інфармацыйныя рэсурсы, актыўна ажыццяўлялася абслугоўванне аддаленых карыстальнікаў, працягвала функцыянаваць віртуальная чытальная зала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Пералік здабыткаў года можна прадоўжыць, аднак хацелася б спыніцца і на праблемах. Яны тычацца перш за ўсё пытанняў укаранення і выкарыстання інфармацыйных тэхналогій. Так, нявыкананы паказчык «Поўная камп'ютарызацыя бібліятэк з падключэннем да сеткі Інтэрнэт і арганізацыяй электроннай пошты з улікам абнаўлення камп'ютарнага парку (20% у год)». Набыта 572 камп'ютары, што склала 33% ад запланаванай лічбы. Пры плане 490 да сеткі Інтэрнэт падключана толькі 122 бібліятэкі. Электронная пошта была арганізавана ў 125 бібліятэках (план 514). Не ўдалося дасягнуць запланаванага абнаўлення камп'ютарнага парку. Сярэдні па рэспубліцы паказчык абнаўлення склаў усяго 11%. Паказчык «Колькасць рэканструяваных і адрамантаваных будынкаў цэнтральных гарадскіх і раённых бібліятэк» таксама нявыкананы: адрамантавана ўсяго 7 будынкаў бібліятэк, што складае толькі 28% ад планавай лічбы. Як бачым, ёсць над чым працаваць усім адказным за выкананне мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг.

У першую чаргу ў бліжэйшай перспектыве дзяржаўная палітыка будзе скіравана на ўдасканаленне прававога поля бібліятэчнай дзейнасці. Ужо распрацаваны праект Кодэкса аб культуры, падрыхтаваны дапаўненні і змяненні ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь». У сувязі з гэтым Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь плануе актуалізацыю шэрагу нарматыўных прававых актаў. Ужо прыняты дапаўненні ў форму дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці. Бліжэйшай задачай у справе ўдасканалення бібліятэчнай статыстыкі з'яўляецца ўнясенне адпаведных дапаўненняў у Інтэграваны банк даных устаноў культуры. Сярод іншых прапаноў – зацвярджэнне Палажэння аб рэестры кніжных помнікаў, Інструкцыі аб парадку арганізацыі і функцыянавання нацыянальнай сістэмы міжбібліятэчнага абанемента і інш. Адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне бібліятэчнай справы стане маніторынг комплексу работ, звязаных з выкананнем шэрагу заданняў па стварэнні электронных рэсурсаў па Скарыніяне, Радзівіліяне і інш.

У выкананні задач, якія звязаны з аптымізацыяй сеткі і мадэрнізацыяй бібліятэк, вялікую ролю адыгрываюць кадры і ўзровень іх прафесійнай кампетэнцыі. Колькасны аналіз кадравага патэнцыялу ў сферы культуры паказаў, што ў 2013 г. замацавалася стабільнасць кадравага складу работнікаў, якая вызначылася ў апошнія гады. Працэс аптымізацыі сеткі ўстаноў культуры, звязаны са скарачэннем колькасці ў першую чаргу ўстаноў клубнага тыпу і бібліятэк, істотным чынам не паўплываў на агульную колькасць работнікаў, якая ў апошнія 5 гадоў вагаецца ў інтэрвале 65,5–66,5 тыс. чал. Пры гэтым працэс забеспячэння ўстаноў культуры кадрамі развіваецца ў бок памяншэння колькасці вакансій спецыялістаў у сярэднім з 10% у 2012 г. да 8,5% у 2013 г. Станоўчыя тэндэнцыі назіраюцца ў забеспячэнні ўстаноў культуры спецыялістамі з высокім узроўнем адукацыі, у тым ліку прафесійнай. Кадравая палітыка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на бліжэйшую перспектыву скіравана на аптымізацыю кадравага забеспячэння дзейнасці ўстаноў і арганізацый культуры, павышэнне якасці работы з кадравым рэзервам, удасканаленне работы па замацаванні маладых спецыялістаў у сферы культуры, неабходнасць кадравага забеспячэння выканання мерапрыемстваў і паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады.

**– Ажыццяўляецца аптымізацыя бібліятэчнай сеткі краіны, адбываецца скарачэнне сельскіх бібліятэк. Як у сувязі з гэтым бачыцца абслугоўванне сельскага насельніцтва?**

У 2013 г. працягвалася работа па аптымізацыі сеткі публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пераважна ў сельскай мясцовасці. Агульнавядома, што нязменным спадарожнікам адмоўных дэмаграфічных працэсаў, што назіраюцца ў сельскай мясцовасці ў апошнія гады, з'яўляецца скарачэнне ўстаноў культуры, у тым ліку бібліятэк, утрымліваць якія становіцца эканамічна немэтазгодным. Менавіта па гэтай прычыне па рашэнні мясцовых улад за 2013 г. было закрыта звыш 160 сельскіх бібліятэк.

Як і ў папярэднія гады, дзяржаўная задача па захаванні бібліятэчнага абслугоўвання сельскага насельніцтва вырашалася за кошт пашырэння зоны аб-

слугоўвання стацыянарных бібліятэк і ўвядзення (пры неабходнасці) нестацыянарных форм абслугоўвання – бібліятэчных пунктаў, бібліёбусаў і інш., а таксама стварэння ўстаноў культуры змешанага тыпу – бібліятэк-клубаў, бібліятэк-музеяў. На сённяшні дзень комплекс мер, накіраваных на падтрымку сельскіх бібліятэк, утрымлівае Дзяржаўная праграма ўстойлівага развіцця сельскіх тэрыторый на 2011–2015 гг. Згодна з названай праграмай да канца 2015 г. бібліёбусы павінны функцыянаваць у кожным раёне.

Трэба адзначыць, што згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па ўкараненні сістэмы дзяржаўных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва рэспублікі» ад 30 мая 2003 г. № 724 публічная бібліятэка павінна быць у кожным аграгарадку. Аднак статыстыка сведчыць аб невыкананні дадзенага сацыяльнага нарматыву шэрагам рэгіёнаў. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці публічныя бібліятэкі адсутнічаюць у 20 аграгарадках.

У цэлым па выніках 2013 г. на 2,4 тыс. жыхароў краіны прыпадае адна публічная бібліятэка, што практычна адпавядае міжнародным нарматывам.

**– У адпаведнасці з даручэннем Урада ў сельскай мясцовасці ажыццяўляецца інтэграцыя сельскіх публічных і школьных бібліятэк. Якія папярэднія вынікі эксперымента і дзе найбольш рацыянальна ён праведзены?**

– Так, сёння ў краіне па даручэнні Урада працягваецца распачаты ў кастрычніку 2011 г. эксперымент па стварэнні інтэграваных бібліятэк у асобных сельскіх населеных пунктах на базе школьных або публічных бібліятэк, які з'яўляецца адным са шляхоў аптымізацыі інфраструктуры сацыяльнай сферы сяла.

Міністэрствамі культуры і адукацыі, адказнымі за правядзенне эксперымента, былі распрацаваны Метадычныя рэкамендацыі па інтэграцыі (аб'яднанні) сельскіх публічных бібліятэк і бібліятэк устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і арганізацыі іх дзейнасці. Згодна з названым дакументам галоўным крытэрыем выбару населеных пунктаў для правядзення эксперымента вызначаны дыферэнцыраваны падыход, які грунтуецца на максімальным уліку ўсіх мясцовых фактараў. Галіновай прыналежнасцю аб'яднанай бібліятэкі павінна застацца сфера культуры. Менавіта такі падыход дазваляе атрымліваць эканамічны эфект і адначасова захоўваць інфармацыйную роўнасць сельскага насельніцтва з гарадскім.

На пачатак 2013 г. удзельнікамі эксперымента з'яўляліся 109 населеных пунктаў з 218 публічнымі сельскімі і столькімі ж школьнымі бібліятэкамі. Яшчэ 99 населеных пунктаў былі вызначаны мясцовымі органамі выканаўчай улады для правядзення паэтапнай планавай інтэграцыі ў 2013–2014 гг.

Як сведчаць папярэднія вынікі дадзенага эксперымента, інтэграцыя публічных і школьных бібліятэк пры ўзважаным падыходзе не прывяла да памяншэння паказчыкаў бібліятэчнага абслугоўвання ці зніжэння яго якасці.

Аптымізацыя бібліятэчнай сістэмы краіны будзе працягвацца і ў гэтым годзе.

**– Васілій Мечыслававіч, у галіне бібліятэчнай справы камплектаванне бібліятэчных фондаў з'яўляецца дзяржаўным прыярытэтам. Як бібліятэкі выконваюць паказчыкі ў гэтым кірунку сваёй дзейнасці?**

– Камплектаванне фондаў публічных бібліятэк ажыццяўлялася ў 2013 г. у адпаведнасці з шэрагам даручэнняў Прэзідэнта і Урада краіны, у тым ліку па вылучэнні на камплектаванне бібліятэчных фондаў не менш за 15% сродкаў з мясцовых бюджэтаў, якія выдаткоўваюцца на бягучае ўтрыманне бібліятэк (даручэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 лютага 2007 г. № 10/48, п. 269); удасканаленні камплектавання фондаў бібліятэк, у тым ліку з прыцягненнем да гэтай работы прадстаўнікоў бізнес-супольніцтва; паляпшэнні камплектавання фондаў бібліятэк выданнямі, якія выпускаюцца ў рамках дзяржаўнага заказу.

Неабходна адзначыць, што ў цэлым па рэспубліцы ў 2013 г. вышэйназваны нарматыў быў перавыкананы. У сярэднім на камплектаванне фондаў публічных бібліятэк з сумы бягучага бюджэтнага фінансавання выдзелена 16,8%, у тым ліку ў Брэсцкай вобласці – 17,1%; Віцебскай – 15,5%; Гомельскай – 19,6%; Гродзенскай – 15,6%; Мінскай – 16,9%; Магілёўскай – 17,3%; г. Мінску – 15,6%. Аднак дадзены нарматыў не быў выкананы ў асобных населеных пунктах. Так, на камплектаванне публічных бібліятэк Віцебска было накіравана 12,4% сродкаў, прадугледжаных на іх бягучае ўтрыманне, сеткі публічных бібліятэк Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці – 13,6%, сеткі публічных бібліятэк Талачынскага раёна гэтай жа вобласці – 14,7%, Гродзенскай абласной бібліятэкі – 9,5%.

Неабходна адзначыць, што выкананне даручэння Прэзідэнта краіны па выдзяленні на камплектаванне фондаў публічных бібліятэк не менш за 15% сродкаў ад сумы бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне названых устаноў культуры, знаходзіцца пад пастаянным кантролем Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў.

Асноўнымі крыніцамі фінансавання камплектавання па-ранейшаму застаюцца мясцовыя бюджэты. Так, колькасць набытых за кошт бюджэтных сродкаў дакументаў склала 90% ад агульнага аб'ёму новых паступленняў у бібліятэчныя фонды. Разам з тым на камплектаванне накіроўваліся і пазабюджэтныя сродкі. У сукупнасці па рэспубліцы гэта склала 623,6 млн бел. руб. Пазабюджэтныя сродкі найбольш актыўна выкарыстоўвалі бібліятэкі Мінскай вобласці – на закупку кніг і падпіску затрачана 170,9 млн бел. руб. У Гродзенскай вобласці выкарыстана 132,9 млн бел. руб., Віцебскай – 122,4 млн бел. руб.

Прадстаўнікі бібліятэк прымалі непасрэдны ўдзел у рабоце Экспертнага савета па фарміраванні плана выпуску сацыяльна значных выданняў, дзе сумесна з іншымі зацікаўленымі разглядалі рэпертуар літаратуры, прапанаваны ім для набыцця.

Неабходна адзначыць, што вырашалася вельмі важная задача па паляпшэнні якасці бібліятэчных фондаў. Так, за выключэннем Гродзенскай вобласці, удалося не толькі дасягнуць выканання паказчыка абнаўлення фондаў публічных бібліятэк на 5% у год, які быў закладзены ў Дзяржаўную праграму «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг., але нават і перавыканаць яго. Так, у Брэсцкай вобласці і Мінску абнаўленне фондаў склала 5,9%, у Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай – 5,2%.

У 2013 г. асноўную частку сукупнага фонду публічных бібліятэк па-ранейшаму складалі дакументы на папяровых носьбітах. Аднак укараненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій паступова ўносіць змены ў відавы склад інфармацыйных рэсурсаў: яны пачалі актыўна папаўняцца электроннымі выданнямі. На набыццё электронных інфармацыйных рэсурсаў публічным бібліятэкам вылучаліся мэтавыя фінансавыя сродкі ў рамках Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг.

Разам з гэтым засталася нявырашанай задача па паляпшэнні якасці фондаў публічных бібліятэк. Яны працягваюць захоўваць нямала зношаных, дублетных і неактуальных выданняў. На вырашэнні гэтага пытання трэба сканцэнтраваць увагу кіруючых органаў.

*Шчыра дзякуем за размову.*

*Размову правяла Л. Кірухіна*